**Фацеева Г.А., Шарэнда Г.П.**

# ДЗІЦЯЧЫЯ АНІМАЦЫЙНЫЯ ЭКСКУРСІІ ЯК СРОДАК ДАЛУЧЭННЯ ДА БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ

Рэспубліка Беларусь

Турыстычная праграма – гэта не зусім звычайны прадукт: яго нельга памацаць рукамі ці паспрабаваць на смак. Як ні дзіўна турыстычную праграму можна параўнаць з марай. Марай аб падарожжах для дарослых і дзяцей. На сенняшні час турыстычныя кампаніі прапаноўваюць самыя розныя экскурсійныя маршруты для дарослых, а вось на жаль для дзяцей харошых, якасных, разнастайных праграм бракуе.

У асноўным праграмы адаптаваны для дзяцей школьнага ўзроста. Як правіла, дзіцячыя экскурсіі ўключаюць: Мінск з наведваннем Лошыцкага парка, этнаграфічнага музея-запаведніка “Менка”, Хатынь, Алімпійскі комплекс Раўбічы, Сілічы, Заслаўль, Мір, Нясвіж, Навагрудак, Ліда, Бярозаўка, Брэст, Жыровічы, Гродна, Белавежская пушча, Віцебск, Масар, Глыбокае. Экскурсійныя праграмы вельмі цікавыя і насычаныя, пры гэтым, што некаторыя экскурсіі ўзгадняюцца са школьнымі навучальнымі праграмамі. І ўсе гэта так шыкоўна выглядае на паперы. Ці так гэта на самай справе. Як паказвае практыка дзецям цікава 10-30 хвілін, потым цікавасць прападае, калі гэта падлеткі, то яны пачынаюць слухаць музыку, размаўляць па тэлефоне ці з пустым выразам твару слухаць, але не чуць экскурсавода, а калі гэта дзеці малодшага ўзроста, то яны пачынаюць бегаць, шумець, штурхаць адзін аднаго. У такой абстаноўцы вельмі цяжка весці экскурсію. Усе вышэйпералічаныя экскурсіі прапаноўваюцца і для дарослых людзей, але адрозняння ў іх амаль няма.

Спачатку трэба сказаць, што дзіцячыя экскурсіі павіны быць карацей тых, што могуць сабе дазволіць дарослыя. У дзіцячых экскурсіях павіны прысутнічаць элементы гульняў і шоў.

Вашай увазе прапаноўваецца дзіцячая анімацыйная экскурсія “Падарожжа з дзедам Барадзедам па Новаму свету”, якая была зроблена турыстычнай фірмай “Мерцана”. Мэта дадзенай экскурсіі ўзбудзіць цікавасць да архітэктурнай спадчыны Беларусі, папулярызаваць фальклорныя і народныя персанажы, выхаваць любоў да роднай мовы, культуры і краіны.

Усе дзеянні экскурсіі праходзіць у Новым свеце. Новы свет – гэта раён у цэнтры Гародні, які быў заснаваны ў канцы XIX ст. Тут захаваліся дрэвы, двары, сістэма вуліц, драўляныя і каменныя дамы ў стылі рускага і польскага мадэрну, а таксама рэдкага для Гародні канструктывізму. Усё гэта дасць магчымасць узнавіць быт, адчуць атмасферу і дух таго часу.

Рэпазіторый ВДУ

Пачынаецца экскурсія з сустрэчы дзяцей з катом Муркотам, які вельмі сумны, так як згубіў свайго гаспадара дзеда Барадзеда і просіць ў дзяцей дапамагчы яго паклікаць. Яны ўсе разам пачынаюць клікаць. Да дзяцей выходзіць дзед Барадзед вітаецца і просіць дзяцей дапамагчы спець яму песеньку:

Хто я? Дзед-барадзед,
Абышоў белы свет,
А цяпер у ціхі час
Завітаў да вас.

З вамі побач буду ўсюды,
Трэба цуды – зробім цуды,
Трэба казка – раз, два, тры,
Вось і казка вам, сябры!

Пад час экскурсійнай праграмы дзед Барадзед знаёміць дзяцей з гісторыяй Новага света ў форме казкі з малюнкамі, малюнкамі выступаюць экскурсійныя аб'екты. Каля кожнага аб'екта кот Муркот з дзяцьмі гуляе ў розныя гульні – адгадваюць беларускія загадкі, рэбусы, беларускія народкія казкі, гуляюць у "Рыбак з бітком" (Інвентар: "біток" - невялікі мяшочак з пяском, прывязаны да доўгай вяроўкі. Змест: гуляючыя выбіраюць вядучага "рыбака" і становяцца ў круг. У цэнтры знаходзіцца рыбак з "бітком". Рыбак невысока над зямлей круціць "біток", пастуdespite павялічваючы хуткасць яе руху. Пры набліжэнні "бітка" гуляючыя павінны пераскокваць цераз яе, бо, калі тая закране ігрока, ен выбывае з гульні. Гульня закончваецца, калі ў крузе застанецца адзіны ігрок. Ен становіцца рыбаком і гульню можна пачынаць спачатку. Па меры таго, як частка ігракоў выбывае, круг звужваецца.), " пчолкі" (Пчолкі – вельмі працалюбівыя, - яны з раніцы да вечара носяць нектар з кветачак у вуллі, свае хаткі. Вось гэтыя місачкі прыгожыя, што на стульчыках будуць у нас кветачкамі, у іх налітая вадзічка (шклянка ў кожнай). Гэта "мядок" Патрэбна лыжкай драўлянай зачэрпнуць "мядку" і перанесці ў гаршчочак. Тая каманда перамагае, якая хутчэй перанясе "мядок" у гаршчочак і найменш пралье яго па дарозе, а значыць найбольш сабярэ мядку. Памерыўшы шклянкай "мядок", кот Муркот і дзед Барадзед падводзяць вынікі).

Экскурсія скончваецца ў парку Жылібера гульней "Яшчар" і падвядзеннем вынікаў.

**ЯШЧАР**

Дзеці бяруцца за рукі і, стварыўшы круг, пачынае кружыцца з выкананнем песні:

Сядзіць, сядзіць Яшчар,
Гэй, нам, гэй! (Паўтараецца пасля кожнага радка)*



Рэпазіторый ВГУ

На залатым крэсле,
Арэшачкі лушчыць
Да ў каробачку сыпле.
Каробачка няпоўна,
Паедзем да Коўна.
З Коўна да Бяліцы,
Купім чамярыцы
Яшчара паіці.

Яшчар сядзіць у сярэдзіне круга і пільна глядзіць, каб ніхто не засмяяўся, не ўпаў і не спатыкнуўся. Калі хто парушыць гэтае правіла, той павінен аддаць Яшчару фант: аловак, хустку і інш. Пасля разыгрываюцца фанты. Яшчар дастае фант і загадвае ўладальніку фанта пытанні звязаныя з экскурсіяй.

Такім чынам, дадзеная анімацыйная экскурсія паказвае, як можна з дапамогай гульнявых элементаў зрабіць экскурсію цікавай і займальнай для дзяцей. Праз гульню дзеці лепш запамінаюць матэрыял, а фотаздымкі доўга будуць нагадваць ім пра фальклорных персанажаў і Новы Свет.

**Сергачев С.А.**

## «ЗЕЛЕНЫЕ МАРШРУТЫ» ВИТЕБСКОЙ ОБЛАСТИ – ПОТЕНЦИАЛ РАЗВИТИЯ МЕЖРЕГИОНАЛЬНОГО СОТРУДНИЧЕСТВА В СФЕРЕ ТУРИЗМА

Минск, Республика Беларусь

“Зеленые маршруты” – Greenways – это туристские маршруты природного и культурного наследия, проложенные вдоль “зеленых коридоров” – рек, традиционных и исторических торговых путей, естественных природных коридоров. Такие маршруты объединяют регионы, туристские достопримечательности, поддерживают развитие “устойчивого туризма” и отдыха, благоприятного для окружающей среды, пропагандируют здоровый образ жизни и немоторизованные формы передвижения – пешком, на велосипедах, верхом на лошадях, на байдарках и плотах. Одновременно они создают возможности для развития предпринимательства среди местных жителей, для сохранения уникальных природных и культурных ценностей.

Идея создания “Зеленых маршрутов” появилась в контексте формирования идеи активного и здорового образа жизни, развития рекреационных пеших и велосипедных троп. В концепции “Зеленых маршрутов” выделяют четыре основных направления [1, с. 4]:

– экология и образование: “Зеленые маршруты” обеспечивают поддержку экологическим мероприятиям, направленным на сохранение биологического разнообразия;



Репозиторий ВГУ